4. Методика преподавания экономических дисциплин : учеб. пособие / Н. Хужаев, П. Хашимов, Т. Джураев, О. Гимранова: Ташкент, 2005. – 140 с.

УДК 378.095 (430)

## ПОДГОТОВКА В МАГИСТРАТУРЕ: ОПЫТ УНИВЕРСИТЕТА ХОЭНХАЙМ

**В. Н. Босак[1], Т. В. Сачивко[2]**
[1)]Белорусский государственный технологический университет (Беларусь, 220006 Минск, ул. Свердлова 13а; e-mail: bosak1@tut.by)
[2)]Белорусская государственная сельскохозяйственная академия (Беларусь, 213407 Горки, ул. Мичурина 5; e-mail: sachyuka@rambler.ru)

Аннотация. Приведены особенности подготовки в магистратуре в университете Хоэнхайм (Германия). Рассмотрены специальности подготовки в магистратуре на различных факультетах: сельскохозяйственном, естественнонаучном, экономическом.
Ключевые слова: магистратура, университет, модуль, кредит.

## MASTER’S DEGREE TRAINING: EXPERICENCE OF THE UNIVERSITY OF HOHENHEIM

**V. M. Bosak[1], T. U. Sachyuka[2]**
[1)]Belarusian State Technological University (Belarus, 220006 Minsk, 13a Sverdlova st.; e-mail: bosak1@tut.by)
[2)]Belarusian State Agricultural Academy (Belarus, 213407, Gorki, 5 Michurina st.; e-mail: sachyuka@rambler.ru)

Summary. Peculiarities of the master's degree training at the University of Hohenheim (Germany) were revealed. Specialties of the master's degree training at various faculties (agricultural, natural sciences, economic) were considered.
Key words: magister studies, university, module, credit.

## ПАДРЫХТОЎКА Ў МАГІСТРАТУРЫ: ВОПЫТ УНІВЕРСІТЭТА ХАЭНХАЙМ

**В. М. Босак[1], Т. У. Сачыўка[2]**
[1)]Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (Беларусь, 220006 Мінск, вул. Свярдлова 13а; e-mail: bosak1@tut.by)
[2)]Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія (Беларусь, 213407 Горкі, вул. Мічурына 5; e-mail: sachyuka@rambler.ru)

Анатацыя. Прыведзены асаблівасці падрыхтоўкі ў магістратуры ў ўніверсітэце Хаэнхайм (Германія). Разгледжаны спецыяльнасці падрыхтоўкі ў магістратуры на факультэтах: сельскагаспадарчым, прыродазнаўчым і эканамічным.
Ключавыя словы*:* магістратура, універсітэт, модуль, крэдыт.

Падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для разнастайных галін эканомікі, у тым ліку і для аграпрамысловага комплексу, з’яўляецца адной з прыярытэтных задач любой дзяржавы. Асабліва актуальным з’яўляецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГАУ

вывучэнне асаблівасцей падрыхтоўкі спецыялістаў у замежных краінах (напрыклад, Германіі), улічваючы далучэнне Беларусі да Балонскага працэсу [4].

Пасля далучэння Германіі да Балонскага працэсу, больш за 80% вышэйшых навучальных устаноў перайшлі на падрыхтоўку спецыялістаў у бакалаўрыяце (6 семетраў) і магістратуры (4 семестры).

Старэйшай вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установай Германіі з’яўляецца ўніверсітэт Хаэнхайм (Штутгарт, Федэральная зямля Бадэн-Вюртэмберг), які заснаваны ў 1818 г. [1–3, 5].

На дадзены момант універсітэт Хаэнхайм складаецца з трох факультэтаў: факультэт сельскагаспадарчых навук, факультэт прыродазнаўчых навук, факультэт эканамічных і сацыяльных навук.

На факультэце сельскагаспадарчых навук, студэнты, якія маюць дыплом бакалаўра ці спецыяліста, могуць працягваць вучобу ў магістратуры па наступных спецыяльнасцях: сельская гаспадарка (накірункі: аграномія, жывёлагадоўля, сельскагаспадарчая тэхніка, глебазнаўства, аграрная эканоміка); аграбізнес; сельская гаспадарка ў тропіках і субтропіках; спецыяльнае земляробства і раслінаводства; ахова навакольнага асяроддзя і вытворчасць прадуктаў харчавання; экологія глебы, водных і біялагічных рэсурсаў; аграэкалогія; аднаўляльныя рэсурсы і біяэнергетыка; арганічнае земляробства і сістэмы харчавання; біяэканоміка.

На факультэце прыродазнаўчых навук у магістратуры прапаноўваюцца наступныя спецыяльнасці: біялогія; біялагічныя рэсурсы; харчовая медыцына; харчовая мікрабіялогія і біятэхналогія; харчаванне і інжырынг; хімія харчовых прадуктаў; малекулярныя асновы харчавання.

На факультэце эканамічных і сацыяльных навук студэнтам прапануюцца: эканоміка; міжнародны бізнес і эканоміка; камунікатыўны менеджмент; камунікацыі і сродкі масавай інфармацыі; менеджмент; эканамічная інфарматыка; гаспадарчая педагогіка.

Падрыхтоўка ў магістратуры працягваецца 4 семестры. Магістрант за гэты час павінен набраць не меней за 120 крэдытаў. Першыя тры семестры магістранты праходзяць паглыбленую падрыхтоўку па сваёй спецыяльнасці і накірунку, у чацвёртым – рыхтуюць і абараняюць магістэрскую работу (30 крэдытаў) [6–7].

Для паступлення ў магістратуру патрабуецца наяўнасць ступені бакалаўра (ці спецыяліста) па патрабуемай ці роднаснай спецыяльнасці, атрыманай як ва ўніверсітэце Хаэнхайм, так і ў любой іншай вышэйшай навучальнай установе Германіі ці за мяжой.

Частка модуляў ў магістратуры выкладаецца толькі на англійскай мове, таму добрае веданне англійскай мовы, якое павінна быць пацверджана спецыяльным сертыфікатам, з’яўляецца абавязковым.

Адзін модуль, які ўключае лекцыі, практычныя, семінарскія і лабараторныя заняткі, ацэньваецца ў 6 крэдытаў (1 крэдыт – 25–30 вучэбных гадзін). Модулі, дзе дадаткова прадугледжваецца вытворчая практыка ці вялікі аб’ём эксперыментальных даследаванняў, ацэньваецца ў 7,5 крэдытаў. Канкрэтнае напаўненне модуля вызначае адпаведная кафедра (інстытут).

У Германіі, як і ў большасці іншых краін Еўропы, работадаўцы знаёмяцца



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

перш-наперш не з дыпломам, а з дадаткам да дыплому, дзе прыведзены ўсе вывучаемые дысцыпліны і атрыманыя адзнакі. Шэраг тых ці іншых дысцыплін і з'яўляецца асноўным крытэрыем пры ўладкаванні на працу па канкрэтнай спецыяльнасці.

Пасля заканчэння магістратуры суіскальнікі могуць працягнуць падрыхтоўку ў дактарантуры (3 гады) па любых напрамках дзейнасці ў галінах сельскай гаспадаркі, біялогіі ці эканомікі.

ЛІТАРАТУРА

1. Босак, В.Н. Высшая школа Германии: опыт университета Хоэнхайм / В.Н. Босак // Труды БГТУ: Учебно-методическая работа. – 2016. – № 8. – С. 5–8.
2. Босак, В.Н. Особенности подготовки специалистов в университете Хоэнхайм (Германия) / В.Н. Босак, Т.В. Сачивко, С.А. Носкова // Вестник БГСХА.– 2016. – № 1. – С. 124–127.
3. Босак, В.Н. Особенности подготовки специалистов в университете Хоэнхайм (Германия) / В.Н. Босак, Т.В. Сачивко, С.А. Носкова // Вестник БГСХА. – 2016. – № 2. – С. 118–121.
4. Ветохин, С.С. Проблемы качества высшего образования в контексте Болонского процесса / С.С. Ветохин // Труды БГТУ: Учебно-методическая работа. – 2012. – № 8. – С. 10–13.
5. Bosak, V.M. Peculiarities of specialists training for agriculture in Germany / V.M. Bosak, T.U. Sachyuka // Перспективы развития высшей школы. – Гродно: ГГАУ, 2016. – С. 142–145.
6. Studieren an der Universität Hohenheim: Informationen für Studieninteressierte. – Stuttgart: Universität Hohenheim, 2016. – 127 S.
7. Zulassung der Universität Hohenheim für die konsekutiven Master-Studiengänge. – Stuttgart: Universität Hohenheim, 2016. – 11 S.

УДК339.9: 378.07

# ВЛИЯНИЕ ГЛОБАЛИЗАЦИИ И ИНТЕРНАЦИОНАЛИЗАЦИИ НА ФОРМИРОВАНИЕ ОРГАНИЗАЦИОННОЙ КУЛЬТУРЫ ВУЗА

**И. М. Будникевич, И. А. Крупеннак**
Черновицкий национальный университет имени Юрия Федьковича (Украина, 58000, г. Черновцы, ул. Коцюбинского, 2; e-mail:budnikevich@mail.ru; ingulay85@mail.ru)

Аннотация. Систематизированы факторы влияния глобализации и интернационализации на формирование организационной культуры вуза. Рассмотрены угрозы и возможности которые формирует имплементация Болонского процесса.

Ключевые слова: организационная культура вуза, глобализация, интернационализация, Болонский процесс, компетенции.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ